# Наши ветераны сегодня

Уже ежегодной традицией стало в учреждении образования «Ивацевичский государственный профессиональный лицей сельскохозяйственного производства» встречаться в День пожилого человека с теми людьми, кто ушел на заслуженный отдых. Они с радостью приходят в лицей, общаются, встречаются с коллегами. Администрация и профсоюзный комитет организуют для гостей чаепитие, радуют их концертной программой, постановками.

**Именно такая встреча состоялась и в 2019 году.**








ВЫБОРЫ



























# Сустрэча з ветэранамі працы

Добрай традыцыяй у нашай навучальнай установе з'яўляюцца сустрэчы з ветэранамі працы, якія знаходзяцца на заслужаным адпачынку. Гэта першыя памочнікі і мудрай парадай, і добрым словам, і надзейнай справай. Надзіва цёплым і сонечным выдаўся першы дзень кастрычніка. Здавалася, сама прырода спрыяла той цёплай сустрэчы, якую арганізавалі адміністрацыя, прафсаюзны камітэт, савет ветэранаў ліцэя. Ва ўтульнай канферэнцзале ў цёплай дружалюбнай атмасферы ўспаміналіся гады шматгадовай працы, паступовага станаўлення ліцэя. Гаварылі і пра цяжкасці, з якімі даводзілася сустракацца, і пра радасці ад першых перамог, і пра ўпэўненыя крокі наперад...

Дырэктар ліцэя М.Я.Дымовіч расказаў аб сучасным жыцці нашай навучальнай установы. Гутарка суправаджалася паказам фота і відэакадраў. Прагучалі словы шчырага прызнання шаноўным ветэранам за іх шматгадовую сумленную працу, сардэчнасць, той вялікі ўклад, які кожны з іх унёс у капілку добрых спраў і поспехаў ліцэя.

Затым ветэраны працы былі запрошаны ў музейны пакой ліцэя, дзе намеснік дырэктара па вучэбна-вытворчай рабоце І.В.Скарына правёў экскурсію. А ў беларускай хатцы фальклорнай групай у складзе выкладчыкаў, майстроў вытворчага навучання, навучэнцаў была паказана інсцэніроўка "Сватанне". Прагучалі вершы мясцовых паэтаў, народныя песні. Дзяўчаты з 452 групы ў вершаванай форме расказалі пра стравы беларускай нацыянальнай кухні з бульбы і запрасілі ўсіх прысутных паспрабаваць смачныя клёцкі, калдуны, бабку, дранікі...

У сваім заключным слове М.Я.Дымовіч пажадаў усім ветэранам працы моцнага здароўя, даўгалецця, заставацца надалей актыўнымі, каб жыццё было радасным, насычаным, каб не было часу сумаваць. Міхаіл Яўгеньевіч запэўніў прысутных, што маладое пакаленне работнікаў нашага прафесійнага ліцэя працягвае слаўныя традыцыі, пачатак якім паклалі ветэраны працы. І ў гэтай пераемнасці пакаленняў бачыцца будучае нашай навучальнай установы.

Самыя найлепшыя ўражанні засталіся ў прысутных ад сустрэчы ў родным ліцэі. Ад імя ветэранаў працы са словамі шчырай удзячнасці выступілі Л.М.Ганчарэнка і Л.Ф.Самусенка.

Спадзяемся, што гэтая сустрэча застанецца ў нашых сэрцах як добры ўспамін на доўгі час.